ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік Міністра інфармацыі
Рэспублікі Беларусь
________________Д.У.Езерскі

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
________________К.А.Пятруцкая

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Старшыня грамадскага аб'яднання
"Саюз пісьменнікаў Беларусі"
______________А.М.Карлюкевіч

# ПАЛАЖЭННЕ
аб рэспубліканскім творчым
конкурсе юных чытальнікаў
"Жывая класіка – 2026"

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Дадзенае Палажэнне вызначае мэты і задачы рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў "Жывая класіка" (далей – конкурс).

1.2. Палажэнне аб конкурсе распрацавана ў адпаведнасці з Інструкцыяй аб правядзенні адукацыйных і іншых мерапрыемстваў з удзелам навучэнцаў, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 9 верасня 2025 г. № 162.

1.3. Заснавальнікамі і арганізатарамі конкурсу з'яўляюцца Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне "Саюз пісьменнікаў Беларусі", установа адукацыі "Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі" Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, ЗАТ "Сталічнае тэлебачанне".

1.4. Конкурс праводзіцца ў мэтах: павышэння цікавасці дзяцей і падлеткаў да чытання; развіцця і захавання высокіх маральных каштоўнасцяў і ідэалаў беларускага грамадства; выхавання падрастаючага пакалення на лепшых узорах нацыянальнай літаратуры; прыцягнення ўвагі грамадскасці да праблематыкі чытання; пашырэння чытацкага кругагляду; пошуку і падтрымкі таленавітай моладзі; фарміравання нацыянальнай самасвядомасці і грамадзянскай адказнасці; захавання гістарычнай памяці і павагі да подзвігу вызваліцеляў.

1.5. Конкурс праходзіць пад дэвізам: "Стваральная сіла беларускага слова: з рук маці – у сэрца Радзімы". Тэму раскрываюць творы класікаў беларускай літаратуры, прысвечаныя павазе да роднай зямлі, сяброўству і веры ў светлую будучыню, якія перадаюцца ад пакалення да пакалення; разуменню міру і спакою як найвышэйшай каштоўнасці, здабытай дзякуючы самаадданасці абаронцаў Айчыны; стваральнай энергіі

беларускай літаратуры, якая з'яўляецца найважнейшым сродкам духоўнага развіцця, скарбніцай гісторыі народа і вялікай энцыклапедыяй жыцця; увазе да Года беларускай жанчыны, які абвешчаны ў 2026 годзе і сімвалічна пераклікаецца з тэмай нашага конкурсу. Жанчына-маці, жанчына-ваяр, жанчына-захавальніца роднага слова заўсёды была крыніцай жыцця, апорай Радзімы і захавальніцай духоўнасці чалавека.

Пры падрыхтоўцы да конкурсу прапануем звярнуць увагу на творы пісьменнікаў-юбіляраў: Івана Мележа, Івана Шамякіна, Кандрата Крапівы, Змітрака Бядулі, Максіма Багдановіча, Васіля Віткі, Алеся Бадака і многіх іншых. Іх творы – жывое сведчанне неўміручасці роднага слова, якое абуджае ў сэрцах павагу да мінулага, веру ў цяперашняе і надзею на будучае.

Не рэкамендуецца выкарыстанне твораў, якія былі прадстаўлены ўдзельнікамі конкурсу 2025 года (дадатак 4). Гэта дазволіць забяспечыць абнаўленне рэпертуару, развіццё творчай фантазіі і падтрымае імкненне да адкрыцця новых моўных і мастацкіх гарызонтаў у беларускай літаратуры.

2. ПАРАДАК І ЎМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

2.1. Конкурс праводзіцца сярод навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі наступных узроставых груп: 1-4 класы; 5-6 класы; 7-8 класы і 9-10 класы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі і ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

2.2. У склада журы конкурсу на ўсіх этапах ўваходзяць вядомыя дзеячы культуры і мастацтва, настаўнікі, бібліятэкары, пісьменнікі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў.

2.3. Конкурс праводзіцца ў пяць этапаў у адпаведнасьці з праграмнымі патрабаваннямі:

**першы этап** праводзіцца ва ўстановах агульнай сярэдняй і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Колькасць удзельнікаў не абмяжоўваецца, пераможцы прымаюць удзел у раённым этапе конкурсу;

Удзельнікі выконваюць два розныя па жанры і тэматыцы творы. Агульная працягласць выступлення – да 6 мінут. Творы і манера выканання павінны адпавядаць узросту ўдзельніка;

**другі этап** (раённы) – праводзіцца раённымі ўстановамі дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Пераможцы раённага этапу конкурсу, занаўшыя першыя месцы ў кожнай ўзроставай групе, прымаюць удзел у абласным этапе конкурсу.

Удзельнікі выконваюць два розныя па жанры і тэматыцы творы. Агульная працягласць выступлення – да 6 мінут. Творы і манера выканання павінны адпавядаць узросту ўдзельніка;

**трэці этап** (абласны (Мінскі гарадскі) – праводзіцца абласнымі ўстановамі дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і Мінскім гарадскім палацам дзяцей і моладзі.

Удзельнікі выконваюць два розныя па жанры і тэматыцы творы. Агульная працягласць выступлення – да 6 мінут. Творы і манера выканання павінны адпавядаць узросту ўдзельніка.

Пераможцы абласнога (Мінскага гарадскога) этапу конкурсу, па аднаму ў кожнай узроставай групе, прымаюць удзел у **паўфінале**, які праводзіцца ў чэрвені 2026 года арганізатарамі конкурсу. Пераможцы паўфіналу прымаюць удзел у фінальным этапе конкурсу.

Удзельнікі выконваюць адзін з твораў 3 этапа. Агульная працягласць выступлення – да 4 мін. Творы і манера выканання павінны адпавядаць узросту ўдзельніка; не дапускаецца паўтор літаратурнага матэрыялу, выкарыстанага пераможцамі мінулага году (дадатак 4).

**Пяты этап** (фінал) праводзіцца арганізатарамі конкурсу ў жніўні ў г. Мінску адначасова з запісам тэлевізійнай праграмы тэлеканала СТВ ("Сталічнае тэлебачанне").

У фінале прымаюць удзел пераможцы паўфіналу. Удзельнікі выконваюць адзін твор. Агульная працягласць выступлення – да 4 мін.

Цырымонія ўзнагароджання пераможцаў і прызёраў конкурсу і гала-канцэрт, у якім прымаюць удзел творчыя калектывы ўстаноў адукацыі краіны, праводзяцца ў рамках мерапрыемстваў Дня беларускага пісьменства.

2.4. Тэрміны правядзення першага, другога і трэцяга этапаў конкурсу папярэднічаюць тэрмінам правядзення заключнага этапу і вырашаюцца ўстановамі адукацыі, адпаведнымі структурнымі падраздзяленнямі абласных (Мінскага гарадскога) выканаўчых камітэтаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі.

2.5. На кожным этапе конкурсу, акрамя фіналу, вызначаецца па аднаму пераможцу ў кожнай узроставай катэгорыі.

2.6. Конкурсныя выступленні ацэньваюцца адпаведна з крытэрыямі згодна з дадаткам 2 да гэтага Палажэння.

2.7. Для ўдзелу ў чацвёртым этапе (паўфінале) конкурсу ў рэспубліканскі аргкамітэт на nchtdm@nchtdm.by да 2 чэрвеня 2026 г. абласным і Мінскаму гарадскому аргкамітэтам неабходна прадставіць:

заяўку на ўдзел у конкурсе (дадатак 1);

выпіску з пратакола рашэння абласных (Мінскага гарадскога) аргкамітэтаў па выніках абласных (г. Мінск) этапаў конкурсу;

маніторынг удзелу ў конкурсе (дадатак 3).

Персанальная адказнасць за накіраванне калектываў і індывідуальных выканаўцаў на заключны этап рэспубліканскага агляду-конкурсу ўскладаецца на кіраўніка структурнага падраздзялення абласнога

(Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, які ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі.

2.8. Аргкамітэт конкурсу пакідае за сабой права ўсе матэрыялы (відэа і друкаваная прадукцыя), створаныя ў перыяд правядзення конкурсу, выкарыстоўваць на мерапрыемствах некамерцыйнага характару.

2.9 Арганізатары конкурсу маюць права на апрацоўку персанальных дадзеных удзельнікаў (публікацыю спісаў пераможцаў і прызёраў, выданне дыпломаў, афіш і г. д.). Удзел у конкурсе азначае аўтаматычную згоду ўдзельнікаў і іх афіцыйных прадстаўнікоў з умовамі конкурсу і з правам арганізатараў на апрацоўку персанальных дадзеных.

## 3. УЗНАГАРОДЖАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ КОНКУРСУ

3.1. Усе ўдзельнікі фінала конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі лаўрэатаў конкурсу, дыпломамі пераможцаў першай, другой і трэцяй ступеняў адпаведна і каштоўнымі падарункамі ад заснавальнікаў конкурсу.

3.2. Пераможцы першай, другой і трэцяй ступеняў рэспубліканскага конкурсу ўзнагароджваюцца пуцёўкай у Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр “Зубронак”.

## 4. ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ КОНКУРСУ

4.1. Арганізацыя і правядзенне ўсіх этапаў конкурсу асвятляюцца ў сродках масавай інфармацыі гарадскога, абласнога і рэспубліканскага падпарадкавання. Інфармацыя аб правядзенні і выніках конкурсу будзе размешчана на сайце Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі (http://method.nchtdm.by).

4.2. Інфармацыйнымі партнёрамі конкурсу з'яўляюцца: “Выдавецкі дом “Звязда”, часопісы “Вясёлка”, “Бярозка”, “Качели”, “Зорька”, “Рюкзачок” і іншыя СМІ (па ўзгадненню з заснавальнікамі).

4.3. На працягу правядзення этапаў конкурсу здымаюцца сюжэты і дэманструюцца ў эфіры нацыянальных і рэгіянальных тэлеканалаў. Тэлеверсія фіналу конкурсу транслюецца асобнай праграмай у эфіры ЗАТ “Сталічнае тэлебачанне”.

## 5. ФІНАНСАВАННЕ КОНКУРСУ

5.1. Фінансаванне конкурсу забяспечваецца заснавальнікамі Конкурсу за кошт бюджэтных і пазабюджэтных сродкаў.

5.2. Могуць выкарыстоўвацца іншыя крыніцы фінансавання ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

Дадатак 1

Заяўка на ўдзел у рэспубліканскім творчым
конкурсе юных чытальнікаў “Жывая класіка”

| п/п | Узроставая катэгорыя | Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка | Назва ўстановы адукацыі | Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога, кантактны тэлефон | Аўтар і назва твора | Спасылкі на відэа | Звесткі аб удзельніку, якія перашкаджаюць удзелу ў конкурсе |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 1-я ўзроставая катэгорыя (пачатковыя класы) | | | | | | |
| 2 | 2- я ўзроставая катэгорыя (5-6 класы) | | | | | | |
| 3 | 3- я ўзроставая катэгорыя (7-8 класы) | | | | | | |
| 4 | 4 я ўзроставая катэгорыя (9-10 класы) | | | | | | |

Дадатак 2

Крытэрыі ацэнкі выступлення ўдзельнікаў рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў “Жывая класіка”

| № п/п | Крытэрыі | Балы |
|---|---|---|
| 1. | Узровень выканальніцкага майстэрства | ад 0 да 10 |
| 2. | Выбар тэксту твора | ад 0 да 10 |
| 3. | Пачуццё жанравай асаблівасці | ад 0 да 10 |
| 4. | Творчы патэнцыял | ад 0 да 10 |
| **Максімальная колькасць балаў** | | **40** |

Дадатак 3

Маніторынг удзелу ў рэспубліканскім творчым конкурсе юных чытальнікаў “Жывая класіка”

| Этапы | Колькасць удзельнікаў (з іх – навучэнцы устаноў дадатковай адукацыі) | Колькасць аб'яднанняў па інтарэсах (з іх – устаноў дадатковай адукацыі) | Колькасць устаноў адукацыі (з іх – устаноў дадатковай адукацыі) |
|---|---|---|---|
| Раённы (гарадскі) | | | |
| Абласны | | | |

Дадатак 4

СПІС
твораў, выкарыстаных пераможцамі
рэспубліканскага конкурсу юных чытальнікаў
"ЖЫВАЯ КЛАСІКА 2025"

| № п/п | Аўтар | Назва твора |
|---|---|---|
| 1. | Іван Сяркоў | "Мы з Санькам у тыле ворага" |
| 2. | Ніл Гілевіч | "А раніцы ўжо не было" |
| 3. | Янка Маўр | "Завошта?" |
| 4. | Максім Танк | "Жук і слімак" |
| 5. | Пятрусь Броўка | "Зварот музыканта" |
| 7. | Леанід Шыпуля | "Бульбінка і вінаград" |
| 8. | Ніл Гілевіч | "Так скончылася дзяцінства" |
| 9. | Янка Брыль | "Маці" |
| 11. | Марыя Цімінская | "Уся радня пад крыжамі" |
| 12. | Пятрусь Броўка | "Брат і сястра" |
| 13. | Алена Васілевіч | "Рэшата цукерак" |
| 14. | Пімен Панчанка | "Дзеці вайны" |
| 15. | Міхась Лынькоў | "Дзіцячы бацінак" |
| 16. | Міхась Лынькоў | "Васількі" |
| 17. | Іван Сяркоў | "Мы – хлопцы жывучыя" |
| 18. | Уладзімір Караткевіч | "Памяць зямлі беларускай" |
| 19. | Анатоль Грачанікаў | "Крывавая балада" |
| 20. | Казімір Камейша | "Галоўная вярста" |
| 21. | Аркадзь Куляшоў | "Прыгоды цымбал" |
| 22. | Ніл Гілевіч | "А раніцы не было" |
| 23. | Анатоль Грачанікаў | "Крывавая балада" |
| 24. | Ірына Татарынава | "Балада аб гусляры" |
| 25. | Аркадзь Куляшоў | "Алёнка" |
| 26. | Уладзімір Караткевіч | "Памяць зямлі беларускай" |
| 27. | Янка Купала | "Паўлінка" |
| 28. | Максім Танк | "Бой над Беразіной" |